12. **Варанько, К.** «Новыя кнігі : па старонках беларускага друку» / Кацярына Варанько // Роднае слова. – 2004. – № 7. – С. 92.

13. **Нарчук, І. В.** Па старонках бюлетэня «Новыя кнігі» / І. В. Нарчук // Адукацыя і выхаванне. – 2001. – № 2. – С. 76–78.

14. **Нарчук, І. В.** Што чытаць пра Беларусь : (парады бібліёграфа) / І. В. Нарчук // Адукацыя і выхаванне. – 1995. – № 12. – С. 111–112.

15. **Беларускі** каляндар, ...год [Электронны рэсурс] / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2004. – . – 1 вып. у год. – Выд. з 2004 г. – Загаловак з тытульнага экрана.

Summary

*The article tells about the history, structure and purpose of the bulletin «New books: Belarusian printing», published by the National Library of Belarus for already fifty years.*

## ПАВАЖАНЫЯ СТВАРАЛЬНІКІ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА БЮЛЕТЭНЯ «НОВЫЯ КНІГІ»!

*На працягу 35 гадоў працы ў бібліятэцы № 4 гімназіі № 74 я заўжды карыстаюся вашым дапаможнікам. Ён для мяне своеасаблівы аператыўны, інфармацыйны і бібліяграфічны летапіс жыцця нашай Рэспублікі Беларусь. Змястоўны матэрыял бюлетэня дапамагае ў прафесійнай, адукацыйнай, самаадукацыйнай дзейнасці. Дапаможнік знаёміць мяне, настаўнікаў і вучняў гімназіі № 74 з бібліяграфічнымі і фактаграфічнымі матэрыяламі, дзе паведамляецца аб гісторыі, культуры і сучасным жыцці нашага народа. Вельмі важна, што большасць з іх дапамагае вучням падрыхтаваць цікавыя навуковыя работы, а мне правесці з імі бібліятэчную гадзіну не толькі па матэрыялах часопіса, але і з мультымедыйным дыскам, які можна ў вас набыць. У сувязі з юбілеем жадаю ўсім стваральнікам бюлетэня прафесійных і творчых поспехаў у гэтай нялёгкай, карпатлівай працы. Няхай ваша высокае майстэрства і прафесіяналізм заўсёды прыносяць задавальненне, здароўе і дабрабыт.*

***Івахненка Зінаіда Паўлаўна,***
***бібліятэкар гімназіі № 74 г. Мінска***

## ВЕЛЬМІ ВАЖНАЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КРЫНІЦА

*Вось ужо амаль 54 гады я пастаянны чытач беларускай залы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Калі прыходжу працаваць у гэту бібліятэку, у першую чаргу знаёмлюся з інфармацыяй, што змяшчаецца ў летапісах беларускага друку (кніжным, часопісным, газетным) і штомесячным бібліяграфічным бюлетэні **«Новыя кнігі: па старонках беларускага друку»**, які выпускае Нацыянальная бібліятэка Беларусі.*

*Больш за ўсё мяне цікавіць «Беларускі каляндар» або «Каляндар знамянальных дат» – самы поўны з падобных календароў у нашай рэспубліцы.*

*Найбольш карысная для мяне стала рубрыка «Што чытаць пра Беларусь» з раздзеламі «Сацыяльныя (грамадскія) навукі», «Гісторыя», «З гісторыі асобных рэгіёнаў, гарадоў, вёсак», «Этналогія (этнаграфія, народазнаўства)», «Палітыка. Паліталогія», «Права. Юрыдычныя навукі», «Культура. Навука. Асвета», «Музейная справа. Архіўная справа», «Краіназнаўства. Краязнаўства», «Гісторыя навукі», «Асвета. Педагагічная навука».*

*Вельмі каштоўная рубрыка «У полі зроку рэцэнзента».*

*З матэрыялаў аб відных дзеячах беларускай навукі і культуры за 2008 г., на мой погляд, найбольш змястоўнымі і цікавымі з'яўляюцца кароткія артыкулы аб бібліёграфе і літаратуразнаўцы Н.Б. Ватацы (№ 1), якую я добра ведаў, паэце У.І. Карызну (№ 2), мовазнаўцу, пісьменніку і фалькларысце Ф.М. Янкоўскім (№ 5), гісторыку-славісце У.І. Пічэту (№ 6), кампазітару, народным артысце Беларусі У.У. Алоўнікаву (№ 10).*

*З матэрыялаў бюлетэня «Новыя кнігі» за 2009 г. мне запомніліся кароткія артыкулы аб Усяславу Чарадзею (№ 2), крытыках і літаратуразнаўцах В.Л. Бечыку і В.А. Каваленку (№ 5), лаўрэаце Нобелеўскай прэміі Ж.І. Алфёраву (№ 10).*

*З дадаткаў да «Новых кніг» за 2009 г. мне хацелася б вылучыць «Праз полымя вайны: да 65-годдзя вызвалення Беларусі» (№ 4), «Цуд некранутай прыроды: да 600-годдзя ўстанаўлення ў Белавежскай пушчы запаведнага рэжыму» (№ 9) і «Беларусь туристическая» (№ 11).*

*Вельмі важна, што пераважнай большасці матэрыялаў, змешчаных у бюлетэні, уласціва ўмелае спалучэнне навуковасці і папулярнасці.*

*Напярэдадні 50-годдзя з дня стварэння штомесячнага бібліяграфічнага выдання «Новыя кнігі» віншую яго стваральнікаў і супрацоўнікаў з гэтай знамянальнай датай і хачу выказаць ім найлепшыя пажаданні. Яны робяць вельмі карысную і патрэбную справу ў імя нашай Бацькаўшчыны.*

***Эмануіл Рыгоравіч Іофе,***
***прафесар БДПУ імя М. Танка,***
***доктар гістарычных навук,***
***член Беларускага саюза журналістаў***